# «Добры дзень, вадзіцы – крыніцы!» або Цудадзейная вада ў традыцыйных уяўленнях беларусаў.

***Уяўленні пра цудадзейнасць вады ўзніклі ў свядомасці нашых продкаў, верагодна, дзякуючы яе прыродным якасцям: свежасці, празрыстасці, здольнасці ачышчаць чалавека як у фізічным, так і энергетычным планах. Існуе вялікая колькасць паданняў і легенд пра "жывую" і "мёртвую" ваду. Адна з іх дапамагае чалавеку набрацца моцы і лёгка адужаць свайго праціўніка, другая здольна пазбавіць яго геройскіх якасцей: "Як напіўся валшэбнай вады, Кацігарошка паслышаў у сабе яшчэ болей сілы і за хітрасць хацеў было змея забіць. Падашлі ізнову к мерцвяцам, перва брызнулі на іх жывой вадой — яны сталі, слоўна як жывыя, толькі дыхання ў іх нетуці. Як брызнулі на мерцвяцоў із другой бутылі — брацця ажылі".***




**Месца "выхаду" вады на паверхню зямлі**

Стаўленне да вады цалкам абапіралася на цэласную карціну свету, на ўсю складаную сістэму светапоглядных уяўленняў. Статус вады, яе характарыстыкі і, адпаведна, адносіны чалавека да яе прадвызначаліся месцам яе знаходжання і той славай або зняслаўем, якія за ім замацаваліся.

Шматлікія помнікі пісьменнасці сведчаць, што старажытныя славяне з асаблівай пачцівасцю ставіліся да крыніц — месца самастойнага выхаду вады на паверхню зямлі. Месца, дзе пачынала "звінець" вада, ачышчалі ад смецця і буралому, ставілі невялічкія агароджы, маркіравалі апазнавальнымі знакамі. Пазней такім знакам стаў крыж, на які павязвалі ручнік, гэта станавілася месцам маленняў, сустрэч, выканання рытуальных дзеянняў. Каб здзейснілася пажаданне або знікла хвароба, вадзе прыносілі ахвяру — манету або іншыя рэчы; у некаторых выпадках на галінкі дрэва каля крыніцы прымацоўвалі невялічкі кавалак тканіны або пояс. Да крыніцы прыходзілі маладыя, каб прамовіць малітву вернасці, каб заручыцца падтрымкай святога месца, каб іх сумеснае жыццё было такім жа светлым, чыстым, як крынічная вада. Сюды прыносілі немаўлятка, каб далучыць яго да жыццёвай ручаіны роду. І хаця найчасцей за ўсё крыніцы з'яўляліся ў самых непраходных, аддаленых месцах, але адразу ж яны станавіліся святыняй мясцовасці.

Асаблівай пашанай у народным асяроддзі карысталіся яўленыя іконы, а таксама мясціны (дрэва, бераг ракі, крыніца, узгорак), дзе яны былі знойдзены. Як правіла, у тых месцах будавалі капліцы і нават храмы, як, напрыклад, у в. Жыровіцы Слонімскага раёна. Там жа, недалёка адзін ад аднаго, б'юць тры ключы, вада ў якіх лічыцца цудадзейнай. Вобраз Багародзіцы або якіх-небудзь святых, адлюстраваных на яўленых іконах, становіцца апекуном дадзенай мясцовасці.

**Каб прыйсці да вады, трэба ведаць "найлепшы" час**

У стаўленні чалавека да вады дзіўным чынам увасаблялася філасофская праблема суаднесенасці прасторы (месца знаходжання) і часу (таго незвычайнага моманту ў каляндарным колазвароце), якія надзялілі ваду незвычайнымі якасцямі. На перасячэнні гэтых каардынат, пазначаных статусам сакральнасці, і "ўзнікала" тая незвычайная вада, якую ў народзе ахрысцілі "жывой". Этнографы пачатку ХХ ст. пісалі: "Вясной, пасля першага грому, пачынаюць людзі ісці да крыніц памыцца і памаліцца, ідуць у вядомыя дні, здаўна ўстаноўленыя:

на Юр’я, на Міколу, на Ушэсце, на Дзявятніка, на Дзясятніка, на “русальнай нядзелі” (першая пасля Тройцы)”.

Акрамя гэтага, на працягу года было яшчэ некалькі “асаблівых” дзён, калі бралі ваду з крыніц: раніцай на Раство Хрыстова, яе называлі “святочнай”; раніцай у дзень святкавання Стрэчання, або Грамніц (“сраценская” вада); абавязкова клалаціліся аб вадзе, якая набірала цудадзейную моц у ноч з серады на Чысты чацвер (дні Страснога тыдня) — ваду ў вёдрах ці іншых ёмістасцях ставілі пад “адкрытыя” нябёсы на ўсю ноч; незвычайнымі якасцямі валодала “купальская” вада.

Асаблівыя адносіны былі да вады, якую бралі ў дні вялікіх каляндарных ці царкоўных святаў раніцай, на ўзыходзе сонца. Пры гэтым той, хто прыходзіў па ваду першым, станавіўся ўладальнікам самай цудадзейнай вады — “непачатай”.

**Выкарыстанне цудадзейнай вады пасля выканання рытуальных дзеянняў**

Акрамя таго, што на працягу года было шмат дзён, якія падзялялі ваду цудадзейнымі здольнасцямі, нашы продкі заўважылі, што незвычайнай, энергетычна станоўчай, гаючай, “жывой” вада станавілася пасля некаторых рытуальных дзеянняў.

• “Чарадзейнай” лічылі ваду, якая засталася пасля гатавання яек на Вялікдзень, ёй даволі паспяхова лічылі скурныя захворванні.

• Ваду пасля абмывання царкоўнага звона, іконы, хлебнай дзяжы выкарыстоўвалі для лячэння цэлага шэрагу захворванняў энергетычнага кшталту (сурокаў, рожы, спуду і г.д.).

• Вадой, у якую клалі дзевяць пупышак асвечанай вярбы, мылі хворых дзяцей.

• У народнай медыцынс шырока выкарыстоўваўся прыём пералівання вады праз розныя адтуліны: клямкі, завесы, у смаліне, праз заручальны пярсцёнак, а таксама праз рэшата. Лічылася, што так вада набывала незвычайныя здольнасці, яна мяняла сваю структуру і спрыяла лячэнню пярэпалахаў, як дзіцячых, так і дарослых.

• Даволі часта, каб пазбавіцца хваробы, знахары прасілі людзей... прынесці з крыніцы дадому ваду ў роце.

• Незвычайнай лічылі ваду, узятую там, дзе зліваюцца дзве, а яшчэ лепш — тры ручаіны. На Юр’я, калі рыхтаваліся да першага выгану жывёлу на пашу, на самым досвітку гаспадар браў вядро і спяшаўся да гэтага месца. Па цячэнні ён зачэрпваў вядро вады, якой потым гаспадыня абмывала вымя каро?кі, каб яна была “малочная, а не ўрочная”. Такую ж ваду выкарыстоўвалі для лячэння жанчын, якія раптоўна “гублялі” малако.

•Асаблівай павагай карысталася вада, набраная з трох (сямі, дзевяці або дванаццаці) калодзежаў ці ручаін. Добра вядома, што вясельны каравай сімвалізаваў родавую паяднанасць, прычым гэгая знітаванасць прасочвалася ў двух планах. З аднаго боку, самыя паважаныя, самыя блізкія сваякі зносілі на адзін стол муку, соль, цукар, яйкі і ваду ў цэнтр стварэння сусвету — у хату, у якой закладваўся надмурак будучыні роду, а жанчыны-каравайніцы снявалі:

***Звязлі, зняслі***
***Сем бочак мукі па карачай.***
***Звязлі, зняслі***
***Сем фасак масла на каравай.***
***Звязлі, зняслі***
***Сем пудоў цукру на каравай.***
***А Божа мой,***
***Вялік, высок наш каравай.***

* * *

***Каб я знала, каб я ведала,***
***Да што ў тваім караваі***
***Да тры вядры крынічнай вадзіцы,***
***Да тры пуды пшанічнай мучыцы,***
***Да тры фаскі дравічнага масла,***
***Да тры капы перапяліных яек,***
***Да два фунты загранічнае солі.***

Удакладнім, што “тры вядры ўзяты з трох розных калодзежаў або розных крыніц. З другога боку, уся гэтая ідылічная карціна малявалася для таго, каб “перадаць спор” (парадзіць дзетак, паспрыяць ураджайнасці, плоднасці статку) наваствoранай сям’і і перадаць родавую эстафету і надалей. Вада і мука, знесеныя для прыгатавання каравая, былі не чым іншым, як першымі стыхіямі, з якіх утварыўся свет.

• Шыкоўны прыклад таго, як вада і цеста ў сумесным спалучэнні станавіліся прадказальнікамі долі дзіцяці, знаходзім у зборніку беларускіх замоў: “Калі дзіця захварэс на сухоты, трэба расчыніць хлеб, зрабіць пальцамі пасярод дзяжы глыбокую

ямку ў цесце, наліўшы ў яе поўна вады, накрыць дзежку векам. Калі ўжо цеста добра падыдзе і прыйдзе пара садзіць яго ў печ, тады, адкрыўшы века, паглядзець, ці ёсць у гэтай ямцы вада, ці няма. Калі вада ўвабралася ў цеста, гэта бясспрэчнае сведчаняе таго, што ніякія чары не дапамогуць, бо дзіцяці наканавана памерці. У адваротным выпадку маці хворага дзіцяці кліча дзвюх зычлівых да сябе нявестак і робіць такім чынам: адна выкладае на лапату лісце, другая трымае дзіця на руцэ, а калі ўсё лісце пакладзена, садзяць яго на лапату; у гэты час трэцяя зачэрпвае далонню ваду з той ямкі і абмывае дзіця з ног да галавы. І Іадчас гэтага аб- мывання паміж тымі жанчынамі завязваецца наступны дыялог:

- Што ты змываеш? — гаворыць тая, што клала лісце.
- Сухоты! — адказвае тая, што змывала.
- Змывай, змывай, каб не было ніколі

Потым адна бярэ дзіця і нясе яго нібы на падворак, але, як стане з ім у дзвярах, тады першая пытаецца ў яе:

- Штоты выкідаеш?
- Сухоты!
- Выкідай, выкідай, каб не было ніколі.

• Лічылася, што цудадзейную моц вады павялічвалі прадметы, апушчаныя ў яе (манеты, зерне, крыж) і словы (малітвы, замовы), прамоўленыя над посудам з вадой.

• Калі побач з пасскай працякаў ручай або была крыніца ці калодзеж, то вада ў іх таксама лічылася гаючай. У народзе лічылі, што там, дзе жыве “Божая памочніца” - пчала — вада станавілася няпростай. Над такой крыніцай звычайна ставілі капліцу з абразам Салавецкіх святых Зосіма і Савація.

**Выкарыстанне вады ў рытуальных дзеяннях, скіраваных на “павелічэнне”, “прыбаўку”, “поспех”**

Найчасцей за ўсё ў магічных рытуальных дзеяннях, якія павінны былі выклікаць прыбытак, павелічэнне, выкарыстоўвалі ваду, імкнучыся перадаць яе рухавасць, аб’ёмы, чысціню і іншыя якасці.

• Так, жанчыну, якая нарадзіла, аблівалі вадой, што бралі з ручая, каб у яе малако пацякло (прыбывала), “як вада”.

• Перад тым, як паставіць новы вулей, гаспадар на ноч ставіў посуд з вадой на мяркуемае месца. Калі за ноч вада прыбывала або заставалася на тым жа ўзроўні, гэта лічылі спрыяльным знакам, калі ж колькасць вады змяншалася - дрэннай прыкметай. У такім разе выбіралі новае месца.

• Ваду для асвячэння асобных вулляў ці яго пчальніка імкнуліся браць з “сямі іярдан” — з сямі асвечаных крыніц ці калодзежаў.

• Каб стаць добрым паляўнічым, раілі ваду ўзяць з трох калодзежаў, частку яе выліць налева ад сябе, а астатняй прамыць стрэльбу, ціха прамаўляючы: “Гром б’с, бліскавіца паліць, Святы Пётр свінец правіць”.

• Каб стрэльба біла звера напавал, яе абмывалі вадой, якой мылі нябожчыка.

***Аксана КАТОВІЧ***

***Фота Анатоля КЛЕШЧУКА***

**Источник:** Родная прырода. — 2015. — №8. — С. 41-43.

